таварыства ўрачаў; другія не чыталі іх на той простай падставе, што яны іх не бачылі ў газетах ( працы рассылаліся толькі медыцынскім таварыствам, а не індывідуальным асобам). Таму друкуемыя «працы» мелі толькі неабгрунтаваныя выдаткі і займалі месца на паліцах розных медыцынскіх бібліятэк [4, №10 с.6].

Пазней да друкавання ў часопісе былі далучаны і сябры Бабруйскага таварыства ўрачоў, урачы іншых заходніх губерняў, нават дзеячы прыродазнаўчых навук, статысты, некаторыя земскія грамадскія дзеячы.

У Мінску ў тыя гады медыцынскае жыццё хутка пайшло наперад. Павялічылася колькасць прыватных медыцынскіх устаноў, з’явіліся навучальна-дапаможныя медыцынскія школы, ўстановы для падрыхтоўкі асоб з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Усе гэтыя ўстановы, акрамя афіцыйнага і дзяржаўнага кантролю мелі неабходнасць у кантролі грамадскага погляду. Такія функцыі ўзяў на сябе часопіс. Зразумела, што часопіс ад гэтага толькі выйграваў. Па сутнасці, ён з’яўляўся дапаможным навуковым выданнем.

**Літаратура**


1. Современная медицина. 1863. № 2.
2. Современная медицина. 1863. № 14.
3. *Молчанов А.П.* Новые материалы из истории возникновения медицинских обществ Белоруссии.// Здравоохранение Белоруссии. 1969. №5.
4. Минские врачебные известия. 1910. №1 .
5. Минские врачебные известия. 1911. №1–12.
6. Минские врачебные известия. 1912. №1–11.
7. Минские врачебные известия. 1913. №1–12.
8. Минские врачебные известия. 1914. №1,4,5.
9. Минские врачебные известия. 1915. №1,2,3,7,8.


## РЭЛІГІЙНАЯ ПАЛІТЫКА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ЛІТОЎСКАГА АЛЬГЕРДА (1345–1377)


**У. В. Фёдараў**


Перыяд княжання Альгерда з’яўляецца вельмі важным ў гісторыі ВКЛ, ды і наогул, Усходняй Еўропы. У гэты час назіраецца буйная тэрытарыяльная экспансія Літвы на ўсход і на поўдзень, яна пачынае прэтэндаваць на спадчыну былой Старажытнай Русі. Адначасова з гэтым, ціск Тэўтонскага ордэна паступова ўзрастае.

Складаная знешнепалітычная сітуацыя, а ў дадатак да яе ўнутрыпалітычнае становішча дзяржавы – моцныя пазіцыі язычнікаў у ёй і адначасова павышэнне колькасці праваслаўных падданых па меры прасоўвання на ўсход, прымушалі кіруючыя колы праводзіць адпавед-

ную рэлігійную палітыку. Вялікаму князю Альгерду прыходзілася пастаянна лавіраваць паміж гэтымі чыннікамі.

Дадзеная тэма асвятляецца ў даволі значнай групе крыніц: рускіх і беларуска-літоўскіх летапісах, хроніках ордэнскага і польскага паходжання, а таксама ў матэрыялах перапіскі канстанцінопальскіх патрыярхаў з царкоўнымі іерархамі Усходняй Еўропы, рускімі князямі і Альгердам. У гістарыяграфіі ж яна разглядалася ці вельмі павярхоўна і аднабока ў кантэксце рускай праграмы гэтага вялікага князя літоўскага, ці наадварот, грунтоўна асвятляліся асобныя яе аспекты.

Рэлігійная палітыка Альгерда была заканамерным працягам палітыкі яго папярэднікаў: на яе, як і раней, уплывалі як знешнепалітычны, так і ўнутрыпалітычны фактары. Але, у адрозненне ад ранейшых часоў, з'явілася пераважная арыентацыя на ўсход, на праваслаўны свет, што звязана было з рэалізацыяй праграмы па збіранню рускіх зямель і прэтэнзіямі на галоўнае месца ва ўсходнеславянскім свеце.

Прапановы хросту Літвы і яе вялікіх князёў па заходняму ўзору, якія мелі месца з самага пачатку дзяржавы, у азначаны час сталі больш настойлівымі. Яны зыходзілі як з боку Ордэна, ціск якога ўзмацніўся ў перыяд пасля 1343 г. [13, с. 203], так і з боку Польшчы, якая актывізавалася на ўсходнім напрамку з 1320-х гг. Цікава, што між дзяржавай Пястаў і Тэўтонскім ордэнам адбывалася своеасаблівае суперніцтва за тое, ад каго Літва прыме каталіцкі хрост. Гэта было звязана з барацьбой між папствам і германскімі імператарамі за ўплыў у каталіцкім свеце: палякі з'яўляліся праваднікамі інтарэсаў рымскай курыі, тады як крыжакі падтрымлівалі манархаў Свяшчэннай Рымскай імперыі [10, с. 275]. Спробы каталіцкага хросту Літвы мелі месца ў 1349, 1351, 1358 і 1373 гг., але не разглядаліся ўсур'ёз ні Кейстутам [11, с. 224], ні Альгердам, а выкарыстоўваліся імі як сродак адцягвання часу ці прапаганды сваёй рускай праграмы. Так, у 1358 г. ў адказ германскаму імператару Карлу IV на прапанову прыняць каталіцтва Альгерд вылучыў шэраг умоў, галоўнымі з якіх былі праект перасялення Ордэна на мяжу з татарамі і вяртанне ВКЛ захопленых крыжакамі зямель, а таксама патрабаванне, што «уся Русь павінна належыць Літве» [8]. Такія ўмовы былі непрымальныя для Ордэну і таму чарговая спроба хросту не мела поспеху. Гэтым спробы навяртання Літвы ў каталіцтва не скончыліся – крыжакі хацелі разыграць карту князёў-перабежчыкаў, хрысціўшы іх з мэтай далейшага выкарыстання як прэтэндэнтаў на ўладу ў княстве. Напрыклад, такім чынам быў ахрышчаны Бутаўт, сын Кейстута, які ў 1365 г. збёг у Ордэн [16, с. 204].

З першай чвэрці XIV стагодзя ініцыятыву ў азначаным пытанні стала перахопліваць Польшча. Тлумачылася гэта наяўнасцю агульнага ворага для яе і ВКЛ, якім з'яўляўся Тэўтонскі ордэн. Тут дзяржава Пястаў аддавала перавагу дыпламатычным метадам перад сілавымі, хоць апошнія мелі месца ў 1349 і 1351 гг.

З разгледжанага вышэй бачна, што для Альгерда пераважнай заставалася ўсходняя палітыка.

Дзеля паспяховай яе рэалізацыі патрэбна было не толькі ваенна-палітычнае дамінаванне над рускімі землямі, але наяўнасць адзінага царкоўнага цэнтра Русі, падуладнага Вільні. Літоўская мітраполія, якая ўзнікла яшчэ пры Віцені[12, с. 498], з'ўлялася неабходнай князю не толькі для абароны сваіх падданых ад чужых царкоўных уплываў, але павінна была стаць спадкаемцай дамангольскай Кіеўскай мітраполіі – галоўнага царкоўнага цэнтра ўсходніх славян. Гэта б цалкам абгрунтоўвала прэтэнзіі Альгерда на ўсе рускія землі. Каб здзейсніць сваю задуму, князю неабходна была згода канстанцінопальскага патрыярха. Але пазіцыя Візантыі ў акрэсленым пытанні была на баку Масквы. Тлумачылася гэта бояззю перад заходнімі ўплывамі, бо ВКЛ межавала непасрэдна з каталіцкім Захадам, і перасцярогай ад расколу ў царкве ці кіравання больш разгалінаванай арганізацыяй [5, с. 44].

Кафедра ў Новагародку пасля смерці ў 1330 г. мітрапаліта Феафіла заставалася вакантнай, тады як уладзімірска-суздальскі мітрапаліт Феагност ( які насіў тытул мітрапаліта кіеўскага ) актыўна імкнуўся пашырыць свой уплыў на землі, якія знаходзіліся ў палітычнай залежнасці ад ВКЛ. Гэта прымусіла Альгерда прымаць адпаведныя захады, але яго спроба прызначыць у 1353 г. свайго кандыдата Феадарыта на пасаду літоўскага мітрапаліта насуперак царкоўным канонам сталася няўдалай. Але ўжо праз год, пасля смерці Феагноста і зацвярджэнні на яго месцы Алексія літоўскі князь дамогся прызначэння свайго кандыдата Рамана на новагародскую мітраполію. Згодна з пастановай патрыярха Каліста 1361 г. ў склад яе ўваходзілі Полацкая і Тураўская епархіі а таксама дыяцэзіі былой Галіцкай мітраполіі [7, с. 76]. Такі варыянт задавальняў Альгерда толькі часткова. Тым часам, пасля смерці Рамана ў 1364 г. яго месца заставалася незанятым. Пад час вайны 1368–72 гг. між ВКЛ і Масквой сімпатыі Канстанцінопаля былі выразна на баку апошняй. Але Альгерд здолеў, маніпулючы геапалітычным становішчам Літвы, змяніць сітуацыю на сваю карысць – ён асцярожна нагадаў патрыярху пра магчымасць свайго каталіцкага хросту, а таксама пра парушэнне клятвы аб міры маскоўскім князем Дзмітрыем Іванавічам [7, с. 136–137]. З Візантыі былі прысланы для разбору спрэчак апаксікарыі, адзін з якіх, пралітоўскі

настроены балгарын Кіпрыян быў прызначаны патрыярхам адзіным агульнарускім мітрапалітам пасля смерці ў 1374 годзе Алексія. Цяпер, урэшце, задумы Альгерда пачалі здзяйсняцца. Канчатковай іх рэалізацыі перашкодзіла смерць князя. Яго наступнік Ягайла, спрабаваў спачатку працягваць палітыку бацькі, але ў сілу абставін і некаторых акалічнасцяў гісторыя пайшла іншым шляхам.

Рэлігійнае становішча ў часы Альгерда ўнутры княства, як і пры яго папярэдніках, вызначалася талеранцыяй. Пазіцыі язычнікаў былі вельмі трывалыя, хоць з часоў Гедзіміна ўзмацняецца і праваслаўны элемент у дзяржаве як вынік пашырэння Літвы за кошт тэрыторый на усходзе. Сыны Альгерда ад першага шлюбу, як і некаторыя з яго братоў, былі ахрышчаны ў праваслаўе яшчэ пры жыцці бацькі, тады як сам вялікі князь заставаўся язычнікам[5, с. 354; 6, с. 19; 15; 10, с. 312]. Але гэта ніяк не замінала рэлігійнай талерантнасці ў дзяржаве. Дакладна вядома аб падтрымке жонкамі Альгерда і некаторымі з сыноў праваслаўнай царквы[1, с. 21; 2, с. 109]. У памежных землях, дзе існавалі каталіцкія касцёлы і кляштары, напрыклад, у Падоллі, літоўскія князі вымушаны былі захоўваць ім ранейшыя прывілеі[1, с. 21]. Зафіксаваныя ў некаторых крыніцах звесткі аб закатаванні хрысціян у тыя часы, не зусім адпавядаюць рэчаіснасці: тры віленскія пакутнікі былі забіты не колькі па рэлігійных матывах, столькі за адмову падпарадкоўвацца вялікаму князю[3, с. 28], а гісторыя аб чатырнаццаці закатаваных манахах францысканцах наогул з’яўляецца міфам[9, с. 78].

Такім чынам, пры правядзенні сваёй рэлігійнай палітыкі Альгерд пераважна арыентаваўся на ўсход, на праваслаўны свет, што звязана было з непасрэднай рэалізацыяй яго праграмы па збіранню рускіх зямель. Сам вялікі князь, як і пераважная колькасць яго двара, заставаліся язычнікамі. Звязана гэта было з дзвума прычынамі. Першая з іх палягала ў моцнай ролі рода ў тагачасным літоўскім грамадстве, адной з галоўных фунцыяў якога было выкананне абрадаў, звязаных з культам продкаў[14, с. 252]. Другой, больш важкай прычынай, было нежаданне Альгерда прымаць хрысціянства ні па ўсходняму, ні па заходняму ўзору. На гэта ўплывалі наступныя фактары: з прыняццем праваслаўя падставы для агрэсіі Ордэна засталіся б у моцы, а каталіцкі хрост князя мог зрабіць нездзяйсняльнымі яго планы па здзяйсненню рускай праграмы.

Тым не менш, для зямель сучаснай Беларусі перыяд княжання Альгерда быў карысным і спрыяў далейшаму іх развіццю – дзякуючы ўзмацненню ролі праваслаўя ў дзяржаве яны пэўным чынам палепшылі свой статус, а ў выніку тэрытарыяльнай экспансіі на Русь апынуліся ў

цэнтры ВКЛ, што абумовіла іх большае зліццё з ядром балта-славянскай дзяржавы.

### Літаратура


1. Акты, относящиеся к истории Западной России Т. I СПб., 1846
2. Белоруссия в эпоху феодализма Т. I Мн., 1960
3. *Меендорф I.* Тры літоўскія мучанікі: Візантыя і Літва ў XIV ст. // Праваслаўе ў Беларусі і сьвеце 1993 №1
4. *Мейендорф И.* Духовное и церковное возрождение XIV века и судьбы Восточной Европы Мн., 1992
5. Новгородская I летопись старшего и младшего изводов // ПСРЛ Т.III М., 2000
6. Псковские летописи // ПСРЛ Т. V вып.2 М., 2000
7. Русская Историческая Библиотека Т. VI Приложения СПб., 1908
8. Хроника Германа Вартберга // http://www.ctarbel.narod.ru/vart.htm
9. *Chodynicki K.* Legenda o męczenctwie czeternactu franciczkanów w Wilnie // Ateneum Wileńckie 1927 R.IV Z. 12
10. *Chodynicki K.* Próby zaprowadzenia chrzeccijanctwa na Litwe przed 1386 r. // Przegląd Hictoryczny 1914 T.18 Z. 2–3 C. 215-318
11. *Długocz Jan* Dzejow polckich kciąg dwanaście T.III Kc. IX-X Kraków, 1867
12. *Fijalek J.* Credniowieczne bickupctwa kościoła wcchodniego na Ruci i Litwie. Część I // Kwartalnik Hictoryczny 1896 R.10
13. *Łowmiańcki H.* Agrecia Zakony krzyżackiego na Litwe w wiekach XII-XV // Prucy – Litwa – Krzyżacy Warczawa, 1989
14. *Łowmiańcki H.* Ctudia nad dziejami Wielkiego Kcięctwa Litewckiego Poznań, 1983
15. *Mažeika Raca Joan* Wac Grand Prince Algirdac a Greek-Orthodox Chrictian? // Lithuanuc, 1987 vol.33 №4 http://lituanuc.org/1987/87_4_05.htm#ref
16. *Tęgowcki J.* Pierwcze pokolenia Giedyminowiców Poznań-Wrocław, 1999


## ИНФОРМАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В ГОСУДАРСТВЕННОМ УПРАВЛЕНИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ: СОСТОЯНИЕ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ

**О. И. Черник**

Основной целью использования информационных технологий (далее – ИТ) в деятельности органов государственной власти является повышение эффективности механизмов государственного управления. Приоритетной задачей государственного управления является создание адекватной информационной среды и в ней – устойчивой обратной связи между государством, его официальными органами и обществом. В соответствии с этим осуществляется формирование «электронного правительства».

«Электронное правительство» с технической точки зрения – это система электронного документооборота, в которой обращаются юридически значимые электронные документы (далее – ЭД), связанные с обеспечением отдельных сторон деятельности общественных структур, гра-